# БЕЛАВЕЖСКІ

**Наша газета часта расказвае пра справы ў адной з самых перадавых гаспадарак Беларусі — ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна. Заўтра ў гэтым буйным аграрным комплексе з замкнутым цыклам вытворчасці — справаздачны сход па выніках мінулага гаспадарчага года. Звычайна на такіх сходах размова ідзе пра ўзятыя вытворчыя і сацыяльныя вяршыні. Пра што раскажа акцыянерам генеральны дырэктар Юрый МАРОЗ гэтым разам? Карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з Юрыем Дзмітрыевічам напярэдадні падзеі.**




Ганаровыя ўзнагароды «Прадэкспа-2017», пра якія расказваў генеральны дырэктар.

## 1. КАПЕЙКА ДА КАПЕЙКІ, МІЛЬЁН ДА МІЛЬЁНА

— Акцыянерам, як і чытачам найстарэйшай беларускай газеты, будзе цікава даведацца апошнюю навіну: «Белавежскі» паспяхова паўдзельнічаў у найбольш прадстаўнічай выставе «Прадэкспа-2017», якая прайшла днямі ў Маскве, — распавядае Юрый Мароз. — Наша прадпрыемства ўдастоена ганаровых узнагарод — дыплома і кубка за высокую якасць прадукцыі як «Лепшае прадпрыемства — 2017». Прадукты зельц «Святочны» і «Мядзведжае вушка» ўзнагароджаны залатым медалём і дыпломам як «Лепшы прадукт — 2017». Адначасова праходзіў і міжнародны незалежны конкурс-дэгустацыя «Лепшы смак — 2017», і з улікам водгукаў спажыўцоў наша «Бужаніна запечаная па-белавежску» і сасіскі «Малочныя крэмавыя прэміум» атрымалі дыпломы першай ступені.

Цяпер пра вынікі работы за мінулы год. Маем права сказаць, што яны нядрэнныя: мы выканалі ўсе паказчыкі ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі, і, адпаведна, выкананы ўсе эканамічныя паказчыкі. Прадалі прадукцыі больш чым на 96 мільёнаў. Выпрацоўка на аднаго працуючага склала 57 тысяч, а гэта на 10 працэнтаў вышэй узроўню 2015 года. Прыбытак значна большы, чым летась, рэнтабельнасць 17,3 працэнта.

У раслінаводстве год для нас быў вельмі ўдалым, такіх гадоў раней амаль не было. Упершыню сабралі 61 тысячу тон збожжа — разам з кукурузай. «Каралева палёў» дала 19 тысяч тон. Такім чынам, на 100 працэнтаў забяспечылі сябе збожжам, што з нашым размахам у жывёлагадоўлі вельмі важна.

Ураджайнасць, як і ў мінулы перыяд, склала 61 цэнтнер з гектара. Адна наша гаспадарка сабрала збожжа столькі, колькі не сабралі 45 раёнаў краіны. Мы даказалі таксама, што на складаных камянецкіх землях можна атрымаць і ўраджай буракоў 700 цэнтнераў з гектара. Хоць заўсёды лічылася, што больш за 300—350 цэнтнераў атрымаць нельга.

Калі далей гаварыць пра раслінаводства, то нарыхтавалі дастаткова кармоў — на 30 працэнтаў больш за мінулагодніюю колькасць. Быў створаны трывалы пераходны запас. На ўмоўную галаву жывёлы нарыхтавана 48 цэнтнераў кармавых адзінак, у тым ліку 36 — травяністых.

Прадукцыі раслінаводства на выхадзе атрымалі 140 працэнтаў да ўзроўню 2015 года. Гэта робіць усе нашы планы ў галіне жывёлагадоўлі і не менш амбіцыйныя планы ў перапрацоўцы цалкам рэальнымі.

А вось для жывёлагадоўчага комплексу год быў не простым, давялося папрацаваць, каб захаваць здароўе статка. Тым не менш мы прадалі 20 тысяч тон мяса, з якасцю таксама не горшай, чым у мінулыя гады. Зараз наш жывёлагадоўчы комплекс працуе нармальна, добрыя сярэднясутачныя прыбаўленні ў вазе былі і летась — 697 грамаў на дарошчванні і адкорме і 710 — на адкорме.

Зазначым, што менавіта комплекс дае 70 працэнтаў усёй прадукцыі «Белавежскага». Свініна мае рэнтабельнасць 19,7 працэнта. На фоне агульнай сітуацыі ў краіне, дзе свінагадоўля, на жаль, апынулася ў



пэўным заняпадзе (спадзяюся, што часовым), вынік гэта нядрэнны.

А 17 працэнтаў прадукцыі дае малако, гэта другое месца ў нашай вытворчасці па аб'ёмных паказчыках. І справа не толькі ў колькасці, бо 98 працэнтаў малака здаём найвышэйшым класам «экстра». Рэнтабельнасць яго — 44,2 працэнта.



Цэнтр пасёлка «Белавежскі» з адміністрацыйнымі будынкамі — узор сучаснай аграрнай архітэктуры. А на ўскраіне вырастае яшчэ адна вуліца ўтульных катэджаў, названая ў гонар Юрыя Мароза. Усё яго жыццё фактычна звязана з гаспадаркай.

Хто ведае сапраўдную цану лічбам, той ацэніць і зразумее, якой напружанай калектыўнай працай яны дасягаюцца.

Чатыры мільёны (у новых грашах) атрымалі прыбытку ад малака, а ад свінагадоўлі 10 мільёнаў рублёў. На жаль, дала стратнасць ялавічына — замінусавала на сем працэнтаў. Што тлумачыцца, як мы лічым, пэўнай незбалансаванасцю цаны і затрат, як і паўсюдна па краіне.

Далей пра тое, што датычыцца дойнага статка. Летась выраслі па малаку на 12 працэнтаў, і думаю, што не менш будзе і сёлета. Наша задача ў гэтым годзе — надаіць не менш за 8400 кілаграмаў на карову.

На сённяшні дзень дойны статак — 3500 кароў, за год павінна дадацца галоў 200, ставіць ёсць куды. Лічым, што вытворчасць малака — высокаэфектыўная, і дбаем пра яе.

Калі гаварыць пра перапрацоўчую галіну, пра наш мясакамбінат, то за межы Рэспублікі Беларусь павялічылі рэалізацыю свініны і ў два з паловай разы — каўбасных вырабаў. На гэтай базе ў тры разы павялічылася валютная выручка (да ўзроўню 2015 года).

Што датычыцца вытворчасці камбікармоў, то маем 67 тысяч тон прадукцыі (110 працэнтаў да мінулага ўзроўню). На камбікормавым заводзе запусцілі ўсе яго магутнасці, зараз дадаткова ўводзім грануляванне камбікармоў.

Крышку «прабуксаваў» фірменны гандаль, хоць тавараабарот тут сур'ёзны. У магазінах, якія выкуплены намі, прыбытак. А дзе трэба ўносіць плату за арандаваныя плошчы, за іх ахову, электраэнергію і гэтак далей — пакуль пераглядаюцца страты.

А ў цэлым прыбытак добры — 126 былых мільярдаў, сёння — 12,6 мільёна дэнамінаваных беларускіх рублёў.

## 2. САМІ САБЕ ІНВЕСТАРЫ

— Апошнія пятнаццаць гадоў развіваемся ў асноўным за кошт уласных інвестыцый, — працягвае свой расказ генеральны дырэктар. — Аб'ём капітальных укладанняў у аб'екты вытворчага і сацыяльнага прызначэння складае цяпер 10 мільёнаў васемсот тысяч. Па-ранейшаму шмат будуем. Перш за ўсё працягваем актыўна весці рэканструкцыю комплексу. Гэта для нас на найбліжэйшы час задача нумар адзін. Хаця сур'ёзна працавалі і на малочнатаварных фермах. На дзвюх фермах замест традыцыйных даільных установак паставілі новыя, высокапрадукцыйныя.

Пабудавалі новую сушылку магутнасцю 60 тон за гадзіну з ёмістасцямі на 10 тысяч тон.

Што важна, не забыліся пра жылле: узвялі адзінаццаць дамоў.

***— Мы з вамі выйшлі ў размове на сацыяльную тэматыку...***

— Заработная плата ў нас нармальная. Аператары па доглядзе жывёлы ў свінагадоўлі, якія дасягнулі добрых паказчыкаў, атрымліваюць да 800 рублёў. У аператараў машыннага даення, у якіх малако прадаецца класам «экстра», зарплата 900 рублёў. У механізатараў у напружаны час пасяўной ці ўборкі — да 1700, а зараз сярэдні заробак 600—650 рублёў. З 1 студзеня паднялі зарплату рабочых і спецыялістаў.

Акрамя таго, існуе натуральная плата, якую на гэты год мы павялічылі. Напрыклад, усе, хто прыйшоў працаваць на комплекс і яшчэ толькі вучыцца прафесіі, атрымлівае пяць кілаграмаў мяса на месяц незалежна ад паказчыкаў. І таксама тыя, хто працуе на малочнатаварных фермах і на адкорме. Больш сталыя, вопытныя работнікі атрымліваюць 15 кілаграмаў.

Маем кафэ, папулярнае сярод мясцовага насельніцтва. Праўда, затраты пакуль што перавышаюць іх заробкі, бо ў карэнную рэканструкцыю будынка пад кафэ былі укладзены пэўныя сродкі. Затое зараз людзям ёсць дзе адпачыць, правесці ўсе свае мерапрыемствы — дні нараджэння, вяселлі і іншыя.

***■ Зрабіць прафесію аграрыя паважанай — вось што патрэбна. Давайце шукаць стымулы.***

## 3. ПЛАНЫ ЧАКАНЫЯ І... НЕЧАКАНЫЯ

***— Мяркуючы па ўсім, вы вынікамі задаволены.***

— Так, па выніковасці мінулы год для нас быў вельмі добрым. І закладзена нармальная аснова для будучага ўраджаю. Восеньскую пасяўную мы правялі ў тэрміны, пад поўную патрэбнасць унеслі ўгнаенні. І для веснавой пасяўной маем фактычна ўсё, насенне таксама, засталося крыху прыкупіць эліты. Нам на нашых цяжкіх, камяністых глебах трэба атрымаць гарантавана высокі ўраджай — не менш за 60–65 цэнтнераў з гектара, таму насенне

